УДК 903:902.64 (476)«632»

# МЕЗАЛІТ БЕЛАРУСІ: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ

**Коласаў Аляксандр Уладзіміравіч**
прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі ўстановы адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)
kolosov_arc@mail.ru

*Артыкул падсумоўвае вынікі шматгадовага вывучэння помнікаў эпохі мезаліту на тэрыторыі Беларусі. Разглядаюцца этапы назапашвання крыніц, акрэсліваюцца галоўныя праблемы сучаснага мезалітазнаўства Беларусі, асноўныя накірункі і перспектывы яго развіцця.*

Разуменне аб мезаліце як асобным перыядзе каменнага веку на тэрыторыі Беларусі прыйшло ў канцы 1920-х – першай палове 1930-х гг., дзякуючы намаганням міжваеннага пакалення даследчыкаў, перш за ўсё К. Палікарповіча. Менавіта гэты навуковец быў адным з першых беларускіх даследчыкаў, хто ў сваіх артыкулах ужыў тэрмін «мезаліт» [11]. Аднак да пачатку 1970-х гг. паверхневыя зборы, эпізадычныя шурфоўка і раскопкі мезалітычных стаянак значна абмяжоўвалі магчымасць культурна-храналагічнай індэнтыфікацыі назапашаных крыніц, іх карэляцыі з матэрыяламі сумежных тэрыторый.

Сітуацыя рэзка змянілася ў 1970–1980-я гг. З гэтага моманту ў аснове даследавання мезалітычных помнікаў ляжаў абсалютна новы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

метадалагічны падыход – раскопкі стаянак на шырокіх плошчах з дэталёвай фіксацыяй археалагічных матэрыялаў. Стацыянарныя работы на помніках Верхняга Падняпроўя (В. Капыцін, А. Калечыц, У. Ксянзоў, В. Ліпніцкая, І. Язэпенка), Прыпяцкага Палесся (У. Ісаенка, М. Крывальцэвіч), Панямоння (М. Чарняўскі, А. Гутоўскі, Н. Шаблюк, В. Ліпніцкая, В. Кудрашоў), Беларускага Падзвіння (М. Чарняўскі, Э. Зайкоўскі, У. Ксянзоў) дазволілі стварыць трывалую базу крыніц па мезаліту Беларусі і прапанаваць новы погляд на храналогію і культурную прыналежнасць помнікаў асобных рэгіёнаў краіны [4; 5; 8; 9; 10].

На падставе атрыманых матэрыялаў былі вылучаны лакальныя культуры, якія, як меркавалі даследчыкі, узніклі ў выніку кантактаў мезалітынага насельніцтва і дэманстравалі пераемнасць традыцый у тэхніцы першаснай апрацоўкі і прыладах працы. На ўсходзе Беларусі лакальную спецыфіку эпохі мезаліту падкрэслівалі сожская [4; 5, с. 56–72; 8, с. 48–58] і днепрадзяснінская культуры [8; 9], на захадзе краіны – нёманская культура [2, с. 55–57], на паўночным захадзе – помнікі нарачанскага тыпу [10, с. 75–77].

Аднак у канцы 1990-х – пачатку 2000-х гг. стала відавочным тое, што існуючыя погляды на генезіс і храналогію вылучаных на тэрыторыі Беларусі лакальных мезалітычных культур апынуліся ў вобласці супярэчнасцяў. Удакладненню падлягалі крытэрыі культурнай і храналагічнай ідэнтыфікацыі матэрыялаў, вырашэнне пытання аб характары ўзаемадзеяння мезалітычнага насельніцтва. Усе гэтыя праблемы прыйшлося вырашаць на сучасным этапе даследаванняў.

Вывучэнне мезалітычных помнікаў на мяжы 1990–2000-х гг., выкарыстанне новага метадалагічнага падыходу, заснаванага на вылучэнні кіруючых і тэхналагічна значных форм крамянёвага інвентару, дазволілі даць крыніцазнаўчую ацэнку калекцыйным зборам і адмовіцца ад ідэі аб лакальнай своеасаблівасці эпохі мезаліту ў кантэксце вылучаных раней сінкрэтычных культур – сожскай і днепра-дзяснінскай у Верхнім Падняпроўі [7], нёманскай на захадзе Беларусі, тэрыторыі Літвы і паўночным усходзе Польшчы [14; 15, с. 129].

На дадзены момант на тэрыторыі Беларусі ўдалося зафіксаваць звесткі аб 704 пунктах, на якіх прысутнічаюць матэрыялы эпохі мезаліту. Безумоўна, колькасць улічаных помнікаў і асобных знаходак досыць умоўная, паколькі, як высвятляецца, адны і тыя ж зручныя мясціны, з прычыны розных абставін, асвойваліся першабытным чалавекам неаднаразова. Сістэматызацыя матэрыялаў па эпосе мезаліту Беларусі дазволіла вылучыць тут шэраг старажытных культур – пясочнароўскую, кундскую, бутаўскую, кудлаеўскую, яніславіцкую, нарачанскую (помнікі нарачанскага тыпу) [6; 7; 13].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аднак пры відавочнай культурнай “стракатасці” мезалітычных помнікаў Беларусі на дадзеным крыніцазнаўчым этапе мы не маем прамых доказаў, якія б дазволілі прызнаць аб’ектыўнай ідэю полікультурнага сінтэзу традыцый у складзе асобнай лакальнай культуры – сожскай, днепра-дзяснінскай ці нёманскай. У гэтых культурах канцэптуальна абгрунтоўвалася ідэя аб запазычанні гатовых форм прылад (у першую чаргу, наканечнікаў стрэл), якія, як высвятляецца зараз, былі выкананы ў абсалютна розных тэхналагічных традыцыях – свідэрскіх, грэнскіх, лінгбійскіх і г. д.

Адсутнасць помнікаў з выразнай стратыграфіяй, дадзеных прыродазнаўчых навук значна ўскладняе магчымасці распрацоўкі дакладнай храналогіі мезалітычных культур, вырашэння пытанняў іх генезісу і гістарычных лёсаў. Паходжанне той ці іншай культуры з’яўляецца прадметам шырокіх навуковых дыскусій і расцэньваецца то як вынік інвазіі культурных традыцый [3; 10], то як прыклад канвергентнага шляху развіцця [5; 8].

Уяўленні аб культурах эпохі мезаліту, іх назвы фарміраваліся на пэўным этапе гістарыяграфіі, у залежнасці ад таго, на тэрыторыі якой краіны працавалі даследчыкі. Таму нельга выключаць магчымасць разгляду асобных культурных з’яў у адзіным генетычным полі, як гэта відавочна, напрыклад, для матэрыялаў грэнскай, пясочнароўскай і іенеўскай культур з аднаго боку, кундскай і бутаўскай культур – з другога [гл., напрыклад: 3; 7; 12]. Існуючыя погляды на генезіс і храналогію гэтых культур, паняцце аб тэхніцы першаснай і другаснай апрацоўкі, аб наборы прыладаў патрабуюць прывядзенне ўсіх наяўных крыніц да адной роўніцы.

Прысутнасць на паўднёвым усходзе Беларусі стаянак са знаходкамі пясочнароўскага тыпу дазваляе паставіць пытанне аб лакальных адрозненнях паміж грэнскай культурай Верхняга Падняпроўя з аднаго боку, пясочнароўскай культурай Дзяснінскага басейна – з другога, іенеўскай Волга-Окскага міжрэчча – з трэцяга. Нельга выключаць, што размова ў гэтым плане можа весціся не столькі аб прысутнасці ў Беларускім Падняпроўі новай культурнай з’явы, якая характарызуе мезаліт пэўнага рэгіёна (Дзяснінскага, Волга-Окскага), а колькі аб верагоднай трансфармацыі культуры грэнскіх паляўнічых у канцы плейстацэну – пачатку галацэну.

Культурнае адзінства відавочна для кундскіх і бутаўскіх старажытнасцей. Раннія помнікі гэтых культур датуюцца перадбарэалам – пачаткам барэальнага перыяду і звязаны з пуллійскай традыцыяй. Для яе характэрны высокія паказчыкі пласцініставасці, выкарыстанне адціскальнай тэхнікі, накіраванай на атрыманне рэгулярных пласцін як асноўнага тыпу нарыхтоўкі для вытворчасці прыладаў – у першую чаргу ўкладышавых вырабаў, разцоў і наканечнікаў стрэл. На тэрыторыі Беларусі індустрыі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пуллійскага тыпу зафіксаваны на стаянках Заходняга Падзвіння – Замошша-1 [10, с. 60–63] і Крумплева-1 [1, с. 148], у Панямонні – Пышкі-3 [13, s. 216–224, tabl. CL–CLIX:1–4]. На ўсходзе краіны яе праявай з'яўляецца стаянка Дзедня [7, с. 101–102].

У заключэнні адзначым яшчэ некалькі важных момантаў, якія, на наш погляд, вызначаюць перспектывы далейшых даследаванняў эпохі мезаліту Беларусі. Адным з актуальных накірункаў можа стаць вывучэнне сыравінных рэсурсаў, іх выкарыстанне чалавекам ў сярэднім каменным веку. Нягледзячы на значную колькасць публікацый, досыць прадстаўнічы корпус археалагічных крыніц, абагульняючых прац, накіраваных на ўсебаковы аналіз каменнай сыравіны, яе ўплыву на развіццё першабытных індустрый, пакуль у беларускай археалагічнай навуцы не існуе. Разам з тым, распрацоўка дадзенай тэмы дазволіць прасачыць міграцыі старажытнага насельніцтва, асноўныя шляхі абмену, гаспадарчыя стратэгіі паляўнічых постледавіковага часу, а ў метадалагічным плане – удакладніць тыпалогію і спецыфіку мезалітычных помнікаў, размешчаных поруч або па-за крыніцамі сыравіны.

Структуры пасялення чалавека эпохі мезаліту вызначаюць яшчэ адну тэму навуковых даследаванняў. У яе аснове павінна ляжаць сістэматызацыя і параўнальны аналіз па аб'ектах гаспадарча-бытавога прызначэння, выяўленых на мезалітычных стаянках Беларусі і сумежных тэрыторый за ўвесь перыяд вывучэння. Вынікам працы можа стаць падрыхтоўка базы дадзеных па структурах пасялення, дыферэнцыяцыя матэрыялаў, распрацоўка крытэрыяў іх вызначэння на мезалітычных помніках.

Праца выканана ў межах задання "Мезаліт міжрэчча Дняпра і Сожа: лакальныя адрозненні, храналогія і перыядызацыя помнікаў (ДПНД "Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы" на 2021–2025 гг.).

**Спіс літаратуры**

1. Гурина, Н. Н. Новые данные о каменном веке Северо-Западной Белоруссии / Н. Н. Гурина // Палеолит и неолит СССР / Материалы и исследования по археологии СССР. – М. ; Л. : ИА АН СССР, 1965. – № 131. – С. 141–203.

2. Гурина, Н. Н. Мезолит Литвы и Белоруссии / Н. Н. Гурина // Мезолит СССР / под ред. Л. В. Кольцова. – М. : Наука, 1989. – С. 55–60.

3. Залізняк, Л. Л. Мезоліт заходу Східної Європи / Л. Л. Залізняк // Кам'яна доба України. – Київ : Шлях, 2009. – Вип. 12. – 280 с.

4. Калечиц, Е. Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Е. Г. Калечиц. – Мінск : Наука и техника, 1987. – 158 с.

5. Калечиц, Е. Г. Человек и среда обитания. Восточная Беларусь. Каменный век / Е. Г. Калечиц. – Мінск : Экоперспектива, 2003. – 223 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

6. Калечыц, А. Г. Чалавек і навакольнае асяроддзе: каменны век, Заходняе Палессе / А. Г. Калечыц. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 584 с. : іл.

7. Колосов, А. В. Финальный палеолит и мезолит Посожья / А. В. Колосов. – Могилев : МГУ имени А.А. Кулешова, 2015. – 176 с. : ил.

8. Копытин, В. Ф. Памятники финального палеолита и мезолита Верхнего Поднепровья / В. Ф. Копытин. – Могилев : Могилев. област. укрупн. типография, 1992. – 86 с.

9. Ксензов, В. П. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья / В. П. Ксензов. – Мінск : Наука и техника. – 134 с.

10. Ксензов, В. П. Мезолит Северной и Центральной Беларуси / В. П. Ксензов. – Мінск : ИИ НАНБ, 2006. – 158 с. (Матэрыялы па археалогіі Беларусі ; вып. 13).

11. Палікарповіч, К. М. Палеоліт і мэзоліт БССР і некаторых суседніх краін Верхняга Падняпроўя / К. М. Палікарповіч // Працы сэкцыі археолёгіі. – Менск, 1932. – Т. 3. – С. 218–221.

12. Сорокин, А. Н. Очерки источниковедения каменного века / А. Н. Сорокин. – М. : ИА РАН, 2016. – 248 с.

13. Obuchowski, W. Materiały paleolityczne i mezolityczne z zachodniej Białorusi / W. Obuchowski. – Warszawa : IAU Warszawski, 2009. – 296 s. (Światowit; vol. XVI).

14. Ostrauskas, T. Lietuvos mezolito gyvenviečių periodizacija: Dactaro disertacijos santrauka. Humanitariniani mokslai, istorija (05 H) / T. Ostrauskas ; Lietuvos istorijos institutas. – Vilnius, 1998. – 40 p.

15. Szymczak, K. Epoka kamienia Polski północno-wschodniej na tle Środkowoeuropejskim / K. Szymczak. – Warszawa : Wydawnictwa Fundacji „Historia pro futuru”, 1995. – 191 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова